ПАД МІРНЫМ НЕБАМ БЕЛАРУСІ



# У ГОНАР ПАМЯЦІ І СЛАВЫ

**4 мая, напярэдадні самага значнага, самага галоўнага свята – Дня Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне – грамадска-літаратурная акцыя Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ «Пад мірным небам Беларусі» адбылася ў Цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна г. Гродна (аддзяленне падтрымкі актыўнага даўгалецця ва ўмовах дзённага знаходжання).**

Падтрымка, даўгалецце… Словы, якія сустракаюць на парозе гэтай установы, не могуць не кранаць, не адклікацца ў душах і сэрцах, у нашай свядомасці. Не сакрэт, што пераважна пажылыя людзі, ветэраны працы складаюць нашу аўдыторыю на мерапрыемствах рознага кшталту, з'яўляюцца нашымі чытачамі і слухачамі, аднадумцамі і настаўнікамі. Можна ўпэўнена сказаць, што гэта нашы сябры. І гэтая дружба праверана часам. У народзе прынята наведваць сяброў, віншаваць, прыносіць падарункі да свята, дарыць свае ўвагу і цеплыню. Прыкладна такія мэты былі пастаўленыя перад дэлегацыяй Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі ў наступным складзе: паэтэсы Вольга Алізар і Юлія Мельнік, паэты Андрэй Татур і Дзмітрый Радзівончык. Наведванне гродзенскімі пісьменнікамі розных сацыяльных устаноў стала традыцыяй. Мы стараемся прымеркаваць свае візіты да знамянальных дат, дзяржаўных святаў, каб максімальна напоўніць такія моманты жыватворным духам мастацтва, чалавечнасцю, цеплынёй; падарыць людзям часцінку сваіх сэрцаў.

**ДЛЯ ДАВЕДКІ.** Грамадска-літаратурная акцыя «Пад мірным небам Беларусі» была ініцыяваная Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі ў 2015 годзе. Яна праходзіць з удзелам пісьменнікаў у форме творчых сустрэч, вечароў паэзіі, публічных літаратурных мерапрыемстваў ваенна-патрыятычнай і грамадзянскай тэматыкі ў розных дзяржаўных установах г. Гродна і Гродзенскай вобласці. Мэты акцыі – з дапамогай мастацкага слова аддаць даніну памяці і пашаны ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, савецкаму народу-пераможцу фашызму, выказаць удзячнасць за магчымасць сёння жыць пад мірным небам; прыцягнуць увагу прадстаўнікоў розных пакаленняў да недапушчальнасці паўтарэння жахаў вайны.



Ва ўступным слове пра гэта распавёў адзін з ініцыятараў акцыі, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык. Дзмітрый Мікалаевіч прадставіў сваіх калег. Перад чытаннем уласных паэтычных і публіцыстычных твораў аўтары па чарзе пагутарылі з прысутнымі, падзяліліся сваім адчуваннем моманту, сваім стаўленнем да свята Перамогі. Высветлілася, што вайна пакінула след у сем'ях кожнага з літаратараў. І гэта аб'ядноўвае наш народ, служыць падмуркам да згуртавання перад тварам новых выклікаў і пагроз. Мы абавязаны памятаць і шанаваць гэты слаўны і радасны дзень, гэтае свята са слязамі на вачах, каб бяда не вярнулася ў наш дом. У гэтай думцы выступоўцы і слухачы былі адзіныя. Гучалі шчырыя апладысменты. На тварах гаспадароў чыталася хваляванне…



Да выступоўцаў – Вольгі Алізар, Андрэя Татура, Юліі Мельнік, Дзмітрыя Радзівончыка – далучылася ветэран працы, дзіця вайны Алена Паўлаўна Кушч. Алена Паўлаўна – член Саюза архітэктараў, заслужаны архітэктар Беларусі; па яе праектах пабудаваны гродзенскі мікрараён Румлёва, а таксама вядомы ўсім помнік легендарнаму танку Т-34 на Савецкай плошчы. Жанчына расказвала пра тое, якімі гады Вялікай Айчыннай вайны і фашысцкай акупацыі на працягу ўсяго жыцця застаюцца ў яе памяці. Гэтым цяжкім успамінам (як загінулі яе бабуля і брат, як яны з мамай хаваліся ад фашысцкіх карнікаў) ветэран працы нават прысвяціла і прадэкламавала ўласны верш. Трагічным дзіцячым старонкам біяграфіі Алены Паўлаўны Кушч прысвечана фотаэкспазіцыя ў канферэнц-зале, дзе адбывалася мерапрыемства. Дарэчы, пасля яго гасцей запрасілі на экскурсію па ўстанове. На памяць аб сустрэчы пісьменнікі падарылі гаспадарам кнігу – калектыўны зборнік ваенна-патрыятычнай лірыкі «Память огненных лет» (2025).



У ходзе грамадска-літаратурнай акцыі «Пад мірным небам Беларусі» для наведвальнікаў Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва госці прадэкламавалі свае лепшыя творы ваенна-патрыятычнай лірыкі на тэмы памяці і славы, пра вайну і Перамогу, пра любоў да жыцця і нянавісць да ворага, пра боль жудасных пакут, страт і непераможную сілу чалавечага духу. А яшчэ, вядома, пра адзінства. Бо менавіта яно дапамагло прадстаўнікам розных народаў, якія насялялі Савецкі Саюз, аб’яднаўшыся, атрымаць перамогу ў самай кровапралітнай вайне за ўсю гісторыю чалавецтва. Адзінства вельмі розных людзей, дыялог пакаленняў і светапоглядаў – наша апірышча, упэўнены кожны сумленны творца. Калі мы разам, нас не зламаць, не паставіць на калені. Калі мы адчуваем, паважаем, падтрымліваем адзін аднаго, нам многае па сілах. Нездарма ў назве нашай пісьменніцкай арганізацыі на першым месцы стаіць слова «Саюз».

Грамадска-літаратурная акцыя Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ «Пад мірным небам Беларусі» працягвае шэсце па Прынёманскім краі.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** грамадска-літаратурная акцыя «Пад мірным небам Беларусі» і яе ўдзельнікі ў Цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна г. Гродна (аддзяленне падтрымкі актыўнага даўгалецця ва ўмовах дзённага знаходжання). 4 мая 2026 года.









ПАД МІРНЫМ НЕБАМ

БЕЛАРУСІ







Вольга Алізар





Андрэй Татур






Юлія Мельнік




Дзмітрый Радзівончык прачытаў нарыс пра свайго дзеда-франтавіка



У цэнтры – Алена Паўлаўна Кушч



Кніга – у падарунак гаспадарам

ПАД МІРНЫМ НЕБАМ
БЕЛАРУСІ


Дзмітрый Радзівончык і загадчык аддзялення Маргарыта Габрыяновіч




Алена Паўлаўна Кушч. Дзяцінства, апаленае вайной




1945






ПАД МІРНЫМ НЕБАМ

БЕЛАРУСІ




На экскурсіі па ўстанове




ПАД МІРНЫМ НЕБАМ

БЕЛАРУСІ

